* *Новикова, А. А.* Телевизионная реальность: экранная интерпретация действительности / А. А. Новикова ; Нац. исслед. ун-т «Высшая школа экономики». – М. : Изд. дом Высшей школы экономики, 2013. – 240 с.

**І. В. Хамутова,** *аспірант.*
Навуковы кіраўнік – **В. А. Лабачэўская,**
*доктар мастацтвазнаўства, дацэнт*

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫВУЧЭННЯ ТРАДЫЦЫЙНЫХ АБРАДАЎ

Фактаграфічная база даследаванняў, прысвечаных вывучэнню традыцыйнай абраднасці беларусаў, пачала фарміравацца даволі рана. Так, напрыклад, З. Даленга-Хадакоўскі зрабіў першую спробу комплекснага, сістэматызаванага запісу народных песень у іх жанравай разнастайнасці і вялікай колькасці – больш за 2000 узораў – і на вялікай тэрыторыі – ад Карпат да Гомеля. Увогуле, нашы папярэднікі заклалі падмурак для тэарэтычных і практычных пошукаў, акрэслілі шляхі і вектары навуковых даследаванняў. Назапашана вялізная база матэрыялаў, але яны патрабуюць асэнсавання, інтэрпрэтацыі ў рэчышчы сучасных пазіцый.

Зараз традыцыйныя абрады вывучаюць не толькі фалькларысты і этнографы, а таксама культуролагі, якія выкарыстоўваюць культуралагічныя падыходы і метады, што дазваляе глыбей даследаваць дадзеную тэму і пад іншым ракурсам. Падрабязней спынімся менавіта на культуралагічных падыходах і метадах.

Адным з найважнейшых падыходаў даследавання традыцыйных абрадаў з’яўляецца семіятычны падыход. Семіятычны аналіз дазваляе высветліць, як арганізавана культурнае паведамленне, што яно выказвае і з дапамогай якіх элементаў дапамагае зразумець ідэі аўтара і глыбінныя сэнсы тэксту [5]. Аснова семіятычнага паняцця культуры – натуральная мова. Акрамя таго, што мова забяспечвае «сырым матэрыялам» шматлікія другасныя мадэлюючыя сістэмы, натуральная мова – адзіны сродак, з дапамогай якога ўсе сістэмы могуць

быць інтэрпрэтаваныя, замацаваныя ў памяці і ўведзеныя ў свядомасць індывіда і групы [8].

Яшчэ адным значным падыходам з’яўляецца структурна-функцыянальны падыход. Практычна ўся культурная антрапалогія пабудавана на даследаваннях і практыцы прымянення дадзенага падыходу. Канцэпцыю функцыяналізму заснаваў Д. Э. Дзюргкейм, які першым сфармуляваў праблемы, якія тычацца функцыянальнага падзелу працы ў арганізацыі і ўзаемазвязанасці функцый сістэмных адзінак. Структурна-функцыянальны падыход распрацоўвалі антраполагі А. Р. Браўн і Б. К. Маліноўскі. Яны разглядалі грамадства – сацыяльны аб’ект – як адаптыўную сістэму, дзе ўсе элементы структуры служаць задавальненню патрэбаў усёй сістэмы і забяспечваюць тым яе існаванне ў навакольным асяроддзі [10]. У дадзеным напрамку можна разгледзець традыцыйныя абрады як структураваную сістэму, пабудаваную на функцыянальнай аснове зместу абрадавых дзей.

Сістэмны падыход дазваляе разгледзець традыцыйны абрад як цэласны комплекс, таму што гэта кірунак метадалогіі даследавання, у аснове якога ляжыць разгляд аб’екта як цэласнага мноства элементаў у сукупнасці адносін і сувязяў паміж імі, гэта значыць, разгляд аб’екта як сістэмы [9]. Мэта сістэмнага падыходу: выявіць унутраную арганізацыю, спасцігнуць прыроду і ўсталяваць логіку таго парадку, які здольны даць навукоўцу шанец зразумець усе бакі і грані аб’екта назірання як самаарганізаванага або свядома ўзнаўлёнага з захаваннем яго цэласнасці. Правільны, паслядоўны і дакладны аналіз аб’екта з пункту гледжання яго сістэмнай прыроды арыентаваны не на падрабязнае апісанне, а, перш за ўсё, на вызначэнне ўсіх яго функцыянальных залежнасцяў і сувязяў, якія абумоўліваюць цэласнасць і функцыянальнае адзінства самога аб’екта.

Для больш глыбокага разгляду кожнага з складальнікаў традыцыйнага абраду выкарыстоўваецца тыпалагічны падыход – сукупнасць метадалагічных працэдур і адпаведных ім разумовых аперацый, арыентаваных на разуменне складаных з’яў у іх структурнай самадастатковасці, у іх станаўленні і адасабленні ў адносінах да гетэрагеннага асяроддзя [11].

Даследаванне традыцыйных абрадаў будуецца на аснове міждысцыплінарнага падыходу да аналізу паходжання, развіцця, функцыянальнай накіраванасці і эвалюцыі сэнсаў абрадаў, дастаткова распаўсюджана, з выкарыстаннем прынцыпу гістарызму.

«Метад (ад фр. methode, грэч. methodes) – 1) спосаб пазнання, даследавання з'яў прыроды і грамадскага жыцця, напрыклад, эксперыментальны метад; 2) прыём, сукупнасць прыёмаў у практычным ажыццяўленні чаго-небудзь, дасягненні практычнай мэты» [2].

Каб больш дакладна даследаваць традыцыйную культуру, неабходна звярнуцца да кампаратыўнага метаду (ад лац. – параўнальны спосаб) – метаду пазнання, які прадугледжвае параўнальна-гістарычнае даследаванне культуры. Калі параўноўваюцца артэфакты і культурныя ўніверсаліі ў рамках адной культуры ў іх часовым развіцці, то такое даследаванне з'яўляецца тэмпаральна-кампаратыўным, а атрыманыя звесткі дазваляюць выявіць эвалюцыю культуры ўнутры грамадства ў пэўны перыяд часу. Калі даследуецца сувязь дадзенай культуры з шэрагам іншых культур і іх адрозненне, то дадзеныя кампаратыўнага аналізу дапамагаюць зразумець узаемаўплыў розных культур, іх адзінства і адрозненне, абумоўленае мноствам фактараў [4].

У вывучэнні традыцыйных абрадаў кампаратыўны метад прадуктывен дзеля параўнання і супрацьпастаўлення лакальных версій абрадавых дзей і музычнага складальніка з уласцівымі наогул для этнаграфічнага рэгіёну або, нават, традыцыямі іншага этнасу.

У 1920-е гг. быў пакладзен пачатак зусім новага этапу ў вывучэнні традыцыйных абрадаў беларусаў, у прыватнасці, Заходняга Палесся, якое багата на культурную спадчыну. Этналагічнае даследаванне стала не проста апісальным, як было дагэтуль, а выйшла на ўзровень параўнання і тэарэтычнага абагульнення, дзякуючы метаду непасрэднага назірання [7, с. 431]. Нельга не пагадзіцца з Б. Маліноўскім, які ў рабоце «Навуковая тэорыя культуры» адзначыў: «Палявы этнограф не можа займацца назіраннем, пакуль яму невядома, што значна і істотна, а што варта адкінуць як пабочнае і выпадковае. Такім

чынам, доля навуковасці у любой антрапалагічнай рабоце складаецца ў стварэнні тэорыі культуры, узаемазвязанай з метадам палявога назірання і з сэнсам культуры як працэса і як выніку» [6, с. 16–17].

Базавымі аспектамі вывучэння фальклору ў XX ст. сталі: назіранне, эксперымент, аналіз, сінтэз і сістэматызацыя. Асаблівасцю і сучасных антрапалагічных навук з’яўляецца метад непасрэднага назірання, які патрабуе, каб даследчык жыў сярод людзей, якіх вывучае [3, с. 25]. З цягам часу дадзены метад не губляе сваёй актуальнасці і выкарыстоўваецца даследчыкамі традыцыйных абрадаў.

Немалазначным метадам даследавання, які трэба выдзяляць, стаў сучасны метад – аўдыёвізуальны, бо аўдыёвізуальная фалькларыстыка – субдысцыпліна фалькларыстыкі, якая займаецца метадалогіяй відэафіксацыі фальклорнага матэрыялу, яго аналізам з дапамогай спецыялізаваных сродкаў, у тым ліку праграмных, і яго публікацыяй. Прычым, публікацыі могуць мець тэкставую форму, пры якой перадаюцца візуальныя і аўдыёшэрагі (наколькі гэта магчыма), могуць мець фармат мультымедыйнага праекта, размешчанага на якім-небудзь інфармацыйным рэсурсе ў глабальнай сетцы Інтэрнэт або на асобным носьбіце, і фармат дакументальнага кіно-, відэафільма або відэароліка [1].

Напрыканцы трэба адзначыць, што культуралагічныя аспекты вывучэння традыцыйнай абраднасці будуюцца на комплексе тэарэтыка-метадалагічных падыходаў, напрыклад, вышэйразгледжаных семіятычнага, структурна-функцыянальнага, сістэмнага, міждысцыплінарнага, тыпалагічнага падыходу і метадаў, такіх як кампаратыўны, непасрэднага назірання, эксперымента, аналіза, сінтэза і сістэматызацыі, а таксама аўдыёвізуальнага.


*1.* Аудиовизуальные исследования фольклора [Электронный ресурс] / В. Л. Кляус [и др.] // Новые российские гуманитарные исследования. – Режим доступа: http://nrgumis.ru/articles/2048/. – Дата доступа: 16.12.2020.

*2. Булыка, А. М.* Слоўнік іншамоўных слоў: каля 25 000 слоў і тэрмінаў : у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1999. – Т. 2. – 734 с.

3. *Дарашэвіч, Э. К.* Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Э. К Дарашэвіч. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с.

4. Компаративный метод [Электронный ресурс] // Центр военно-политических исследований. – Режим доступа: http://eurasian-defence.ru/?q=komparativnyy-metod. – Дата доступа: 16.12.2020.

5. Культурологический журнал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://cr-journal.ru/rus/journals/79.html&j_id=7. – Дата доступа: 16.08.2021.

6. *Малиновский, Б. К.* Научная теория культуры = A scientific theory of culture : пер. с англ. / Б. К. Малиновский ; вступ. ст. А. К. Байбурина. – 2-е изд., испр. – М. : Объед. гуманитар. изд-во, 2005. – 182 с.

7. Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – Вып. 5. – 591 с.

8. Семиотический подход в изучении культуры [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://iskusstvoed.ru/2017/03/23/semioticheskij-podhod-v-izuchenii-kul/. – Дата доступа: 12.08.2021.

9. Системный метод исследования [Электронный ресурс] // Мир знаний. – Режим доступа: https://smekni.com/a/213657/sistemnyy-metod-issledovaniya/. – Дата доступа: 16.12.2020.

10. Структурна-функцыянальны падыход у сацыялогіі. Заснавальнік структурна-функцыянальнага падыходу [Электронны рэсурс] // TostPost.com. – Рэжым доступу: https://tostpost.com/be/adukacyya/15366-strukturna-funkcyyanal-ny-padyhod-u-sacyyalog-zasnaval-n-k-strukturna-.html. – Дата доступу: 16.12.2020.

11. Типологический подход [Электронный ресурс] // Гуманитарный портал. – Режим доступа: https://gtmarket.ru/concepts/7233. – Дата доступа: 16.12.2020.

**Хуан Ичэн,** *соискатель.*
Научный руководитель – **А. И. Смолик,**
*доктор культурологии, профессор*

## МОДА КАК СЕГМЕНТ ИНДУСТРИИ КУЛЬТУРЫ КИТАЙСКОЙ НАРОДНОЙ РЕСПУБЛИКИ

В современной культуре Китая одним из значимых глобальных явлений становится мода. Она представляет собой «совокупность вкусов и взглядов, господствующих в обществе в определенное (обычно недолгое) время и проявляющихся в увлечениях чем-либо, формах быта, одежде и т. п.» [2, с. 549]. Несмотря на то, что становление моды как феномена культуры